УДК 069:908:[069.1-043.83](476)

# Генезіс культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў Беларусі

**_Бамбешка І.І._**
_Установа адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, Мінск_

_Ключавымі тэндэнцыямі сучаснай сацыякультурнай сітуацыі з'яўляюцца, з аднаго боку, універсалізацыя культурнага жыцця, перагляд сацыякультурных норм і каштоўнасцей, а з другога – працэс рэгіяналізацыі і глакалізацыі. Гэта надае асаблівае гучанне пытанням вывучэння, захавання і актуалізацыі гісторыка-культурнай спадчыны сродкамі культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў як самага масавага сегменту музейнай сеткі Беларусі. Культурна-адукацыйная дзейнасць як адзін вядучых накірункаў музейнай дзейнасці, з дапамогай якога рэалізуецца функцыя адукацыі і выхавання, эвалюцыяніравала паралельна з музеямі. У артыкуле здзейснена спроба акрэсліць этапы культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў Беларусі. Тэрміналогія, якая выкарыстоўвалася для абазначэння ўзаемадзеяння музея з яго аўдыторыяй, стала крытэрыем для характарыстыкі і вызначэння этапаў культурна-адукацыйнай дзейнасці. Аўтар прыйшла да высновы, што на працягу кожнага з этапаў рэалізоўвалася пэўная мадэль зносін паміж краязнаўчым музеем і яго аўдыторыяй. Былі вылучаны наступныя мадэлі: асветніцкая (1850-я – канец 1920-х гг.), прапагандысцкая (канец 1920-х – 1960-я гг.), інфармацыйная (1960-я – канец 1980-х гг.) і камунікатыўная (канец 1980-х гг. – сённяшні час)._

_**Ключавыя словы:** краязнаўчы музей, функцыя адукацыі і выхавання, культурна-адукацыйная дзейнасць, музейная аўдыторыя._

_(Искусство и культура. – 2020. – № 2(38). – С. 67–71)_

# Genesis of the Cultural and Educational Activities of Local History Museums in Belarus

**_Bambeshka I.I._**
_Educational Establishment “Belarusian State University of Culture and Arts”, Minsk_

_The key trends in the current social and cultural situation are, on the one hand, the universalization of cultural life, the revision of social and cultural norms and values, and on the other, the process of regionalization and globalization. This attaches particular importance to the study, preservation and updating of historical and cultural heritage through the cultural and educational activities of local history museums as the most massive segment of the museum network of Belarus. Cultural and educational activity as one of the leading areas of museum activity, due to which the function of education and upbringing is carried out, developed in parallel with museums. The article attempts to highlight the stages of the cultural and educational activities of local history museums in Belarus. The terminology used to indicate the interaction of the museum with its public has become a criterion for characterizing and determining the stages of cultural and educational activities. The author came to the conclusion that at each stage a concrete model of interaction between the museum of local lore and its public was implemented. The following models were identified: the enlightening (1850s – late 1920s), the propaganda (late 1920s – 1960s), the informative (1960s – late 1980s)) and the communicative (late 1980s years – present time)._

_**Key words:** museum of local lore, function of education and upbringing, cultural and educational activities, museum public._

_(Art and Cultur. – 2020. – № 2(38). – P. 67–71)_

Сучасная культурная сітуацыя вызначаецца шэрагам проціеглых працэсаў. Па-першае, гэта працэсы глабальнай інтэграцыі. Яны характарызуюцца нівеліраваннем нацыянальнай і лакальнай культуры, ставяць пад пагрозу захававанне індывідуальнасці і прыводзяць да т.зв. крызісу ідэнтычнасці. Па-другое, пераадоленне крызісу культурнай ідэнтыфікацыі звязана з неабходнасцю захавання лакальнай своеасаблівасці, якая выклікае разнастайнасць і поліцэнтрычнасць культурнай прасторы інфармацыйнага грамадства. Паколькі пачуццё ідэнтычнасці грунтуецца на засваенні нацыянальнай гісторыка-культурнай спадчыны, то пера-адоленне крызіснай сітуацыі магчыма з яе дапамогай. Не апошняя роля ў працэсе захавання і трансляцыі нацыянальнай

_Адрас для карэспандэнцыі: ivannabombeshko@mail.ru – І.І. Бамбешка_



Репозиторий ВГУ

гісторыка-культурнай спадчыны належыць музеям, у значнай ступені – краязнаўчым, якія займаюць дамінуючае месца ў структуры айчыннай музейнай сетцы. Менавіта краязнаўчы музей можа рэалізаваць місію культурнага, духоўнага, навуковага і прадстаўнічага цэнтра рэгіёна ці пэўнай мясцовасці. Яго дзейнасць па вывучэнні, захаванні і актуалізацыі карэннай самабытнай культуры, з аднаго боку, дапамагае мясцоваму насельніцтву захоўваць этнакультурную ідэнтычнасць, а з другога – прэзентуючы культуру іншых этнасаў, фарміруе міжкультурны дыялог. Сучасная музеялогія разглядае краязнаўчы музей як сацыякультурны інстытут, які займае сваю нішу ў сацыякультурным асяроддзі і галоўным маркерам гэтага з'яўляецца яго культурна-адукацыйная дзейнасць. Перамены ў назве гэтай формы музейнай дзейнасці сведчаць аб эвалюцыі розных пунктаў гледжання на музей і яго месца ў грамадстве.

Праблематыка, якая мае дачыненне да нашага даследавання, знайшла адлюстраванне ў шэрагу публікацый айчынных аўтараў. Так, рэтраспектыўны характар маюць асобныя артыкулы А.А. Гужалоўскага, В.С. Курылёнак, В.У. Міронччык, у якіх аўтары аналізуюць станаўленне культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў Беларусі ўвогуле, закранаючы пытанні фарміравання практыкі работы з аўдыторыяй у мясцовых музеях. Асобныя аспекты сучаснага стану культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў рэспублікі раскрываюцца ў публікацыях І.Б. Лапцёнак. Разам з тым гістарыяграфічны аналіз дазваляе канстатаваць, што пытанні станаўлення культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў і яе генезісу не былі тэмай спецыяльных даследаванняў.

Мэта артыкула – вызначыць этапы фарміравання культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў Беларусі.

**Перадумовы фарміравання культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчых музеяў Беларусі.** У гісторыі музейнай справы Беларусі рэалізацыя ідэі аб адукацыйным прызначэнні і даступнасці музея была звязана са стварэннем першых вучэбных музеяў у 1770-х гг. пры Полацкім езуіцкім калегіуме і Гродзенскай медыцынскай школе. У канцы XVIII – пачатку XIX ст. асобныя прыватныя калекцыі (калекцыі І. Храптовіча, братоў К. і Е. Тышкевічаў і некаторых іншых) становяцца даступнымі для пэўных катэгорый наведвальнікаў. Пастпова колькасць даступных музейных збораў павялічваецца.

У першай палове XIX стагоддзі з'яўляюцца і першыя спробы тэарэтычнага асэнсавання сутнасці музея, якія ўвасобіліся ў распрацоўцы праектаў стварэння нацыянальнага музея і адлюстравалі новы погляд на музей як фактар развіцця навукі, адукацыі, асветы. Азначаныя працы былі падрыхтаваны сябрамі румянцаўскага гуртка Б. Віхманам, Ф. Адэлунгам, беларускім паэтам і публіцыстам Т. Занам [1–3]. Пералічаныя аўтары прадстаўлялі музей як цэнтр канцэнтрацыі значнага комплексу прадметаў, якія дакументавалі гістарычныя, эканамічныя, культурныя і іншыя працэсы, з шырокімі навукова-даследчымі і асветнымі функцыямі. Грамадскае прызнанне адукацыйнай ролі музея таксама праявілася ў стварэнні вучэбных музеяў пры навучальных установах розных узроўняў у Віцебску, Магілёве, Мінску, Горы-Горках. Такім чынам, у Беларусі паступова фарміраваўся погляд на музей як адукацыйны цэнтр рэгіёна, а разам з тым і дзейнасць па абслугоўванні аўдыторыі. Яна таксама эвалюцыяніравала, што дазваляе вылучыць некалькі этапаў у яе развіцці. Для кожнага з іх была характэрна ўласная мадэль успрыняцця музея і яго функцый грамадствам і ўладнымі структурамі. Дынаміка мадэляў з'яўляецца асновай для перыядызацыі культурна-адукацыйнай дзейнасці музея. У якасці крытэрыя для вылучэння этапаў і адпаведных мадэляў была выкарыстана тэрміналогія, якая абазначала ўзаемадзеянне музея з яго аўдыторыяй.

**Асветніцкая мадэль культурна-адукацыйнай дзейнасці музея.** Першаму этапу культурна-адукацыйнай дзейнасці музея, які быў абмежаваны 1850-мі – другой паловай 1920-х гг., адпавядае асветніцкая мадэль. Яна заснавана на адносінах да музея як да дэмакратычнага па сваёй прыродзе інстытута. Менавіта ў гэты перыяд адбываецца станаўленне сеткі агульнадаступных музеяў пры рэгіянальных дзяржаўных установах (губернскіх статыстычных камітэтах), пры навуковых таварыствах. Многія з іх сталі правобразам краязнаўчых музеяў па прычыне сваёй комплекснасці і імкненні дакументаваць развіццё акрэсленай тэрыторыі. Фарміруецца спецыяльны накірунак дзейнасці краязнаўчых музеяў па рабоце з наведвальнікамі. Крыніцы сведчаць аб наладжанай рабоце з аўдыторыяй у Віленскім музеі старажытнасцей, які быў створаны ў 1855 г. Штогод з музеем знаёмілася некалькі тысяч чалавек, а ў 1862 г. колькасць наведвальнікаў дасягнула 10 360 чалавек [4, с. 35]. Такая запатрабаванасць музея ў наведвальнікаў вымусіла яго кіраўніцтва вылучыць спецыяльнага супрацоўніка, які даваў тлумачэнні.

Меншай папулярнасцю ў наведвальнікаў карысталіся музеі пры губернскіх статыстычных камітэтах, якія ствараліся без выразна акрэсленых мэтаў, у тым ліку і ў галіне ўзаемадзеяння з аўдыторыяй. Наведванне гэтых музеяў было магчыма толькі пры

Рэпазіторый ВДУ

наяўнасці спецыяльнага кіраўніцтва губернскага статыстычнага камітэта, у сувязі з чым сярод наведвальнікаў пэўны час пераважалі навукоўцы і даследчыкі. Не спрыялі павелічэнню наведвальнікаў і невялікія экспазіцыйныя плошчы названых музеяў. Таму пашырэнне музеяў у Віцебску ў 1894 г. і Магілёве ў 1898 г. адразу выклікала павелічэнне аўдыторыі [5, с. 10].

Статуты царкоўна-археалагічных камітэтаў сведчаць аб імкненні іх стваральнікаў распаўсюджваць у грамадстве гісторыка-археалагічныя веды праз музейныя экспазіцыі, выставы, публічныя чытанні, што і было рэалізавана. Так, функцыі экскурсавода ў Віцебскім царкоўна-археалагічным музеі выконваў выкладчык духоўнай семінарыі М.М. Багародскі. Ён жа з семінарыстаў арганізаваў гурток, які цесна супрацоўнічаў з царкоўна-археалагічным камітэтам і музеем [6, с. 7]. Падобная сітуацыя назіралася і ў іншых царкоўна-археалагічных музеях.

Важнае адукацыйнае значэнне музея адзначалася многімі педагогамі таго часу (М.В. Наварускім, Я.М. Медынскім і інш.). У канцы XIX ст. музей разглядаўся як адзін з самых дзейсных сродкаў пераадолення крызісу адукацыі, паколькі дазваляў вывучаць асяроддзе на падставе рэальных узораў, сканцэнтраваных у музеі. Музеі пачалі актыўна супрацоўнічаць са школай, уключацца ў сістэму пазашкольнай адукацыі, якая атрымала шырокае развіццё і ў многіх еўрапейскіх краінах. Галоўнай яе ідэяй была арганізацыя культурна-асветніцкай работы сярод дарослага насельніцтва. Так, вялікую цікавасць у жыхароў Гродзенскай губерніі выклікаў краязнаўчы па змесце музей, які быў адкрыты мясцовым педагагічным таварыствам у кастрычніку 1913 г. Ужо ў пачатку 1914 г. колькасць яго наведвальнікаў дасягнула 150 чалавек у дзень, што стала вынікам шырокай тлумачальнай работы, якую праводзілі члены таварыства сярод жыхароў Гродна [7, с. 69].

Паступова фарміравалася меркаванне аб музеі не толькі як навуковым, але і адукацыйным інстытуце. Такія адносіны выклікалі да жыцця і спецыяльныя тэрміны – культурна-асветніцкая работа, пазашкольная адукацыя, якія выкарыстоўваліся для абазначэння новага накірунку музейнай дзейнасці – узаемадзеяння з музейнай аўдыторыяй. Менавіта ў гэты перыяд у рэчышчы педагагічнай навукі ўзнікае радзімазнаўства і краязнаўства як усебаковае вывучэнне пэўнай акрэсленай тэрыторыі. Пачынае разгортвацца адпаведны рух, які садзейнічаў шырокаму распаўсюджанню краязнаўчых музеяў.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі многія культурныя пачынанні дарэвалюцыйнага перыяду не толькі не згортваліся, але і яшчэ больш пашыраліся. Важнасць музеяў у справе адукацыі, абуджэння нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа былі бясспрэчнымі для дэмакратычнай інтэлігенцыі. Асобныя музейныя дзеячы працягвалі ўдзельнічаць у культурных пераўтварэннях. На хвалі беларускага адраджэння і затым беларусізацыі пачынаецца актыўнае вывучэнне Беларусі, стварэнне краязнаўчыя музеі, разгортванне экскурсійнай справы.

Аднак усё часцей пачынаў гучаць тэзіс аб ломцы старой сістэмы, падкрэслівалася прынцыповая розніца паміж "старым" і "новым", паслярэвалюцыйным. У другой палове 1920-х гг. эпітэт "новы" найбольш часта ўжываўся ў адносінах да характарыстыкі тых ці іншых накірункаў дзейнасці, негледзячы на тое, што насамрэч многія з накірункаў працягвалі дарэвалюцыйную традыцыю. Аднак паступова гэта "новае" пачынала праяўляцца больш выразна і канчаткова перамагло, што дазваляе гаварыць аб фарміраванні новай адукацыйнай мадэлі – прапагандысцкай, якая ахоплівае перыяд 1920–1960-х гг.

**Прапагандысцкая мадэль культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчага музея.** Новая адукацыйная канцэпцыя музея знайшла адлюстраванне і ў новай тэрміналогіі, якая стала выкарыстоўвацца для абазначэння работы з музейнай аўдыторыяй: палітыка-асветніцкая, прапагандысцкая, масавая работа. Музей у акрэслены перыяд пачаў разглядацца выключна як "праваднік палітычнай асветы", "палітыка-асветны камбінат", "моцная зброя палітычнай і асветніцкай работы", як сродак нагляднай ілюстрацыі палітычнай дактрыны. Музей як сховішча калекцый надзвычай рэзка стаў проціпастаўляцца музею-газеце, музею-падручніку і г.д. Гэтыя характарыстыкі ўжываліся ў тым ліку і ў дачыненні да краязнаўчых музеяў, якія павінны былі хутка пераарыентавацца на вырашэнне злабадзённых народна-гаспадарчых праблем, да чаго пастаянна заклікалі са старонак галоўнага друкаванага органа беларускіх краязнаўцаў – часопіса "Наш край", а затым – "Савецкая краіна".

Знакавай падзеяй у працэсе станаўлення новай адукацыйнай канцэпцыі музея стаў Першы Усерасійскі музейны з'езд, які замацаваў прыярытэт палітыка-асветніцкай работы над іншымі. Найбольш важным крытэрыем выніковасці работы музея з аўдыторыяй стала масавасць яе ахопу [8, с. 665–669]. Тэзісы з'езда былі пацверджаны і замацаваны на Усебеларускай нарадзе музейных супрацоўнікаў (Мінск, 1932 г.) [9, с. 84]. Такім чынам, змест работы музея з наведвальнікамі звужаўся, паколькі быў арыентаваны выключна на прапаганду палітычнай

Репозиторий ВГУ

дактрыны. Разам з тым савецкія даследчыкі, у прыватнасці М.Ю. Юхневіч, адзначаюць, што нягледзячы на значны ідэалагічны прэсінг, менавіта ў акрэслены перыяд адбывалася пашырэнне рэпертуару работы музея з аўдыторыяй [10, с. 23]. Аналіз жа гісторыі музейнай справы Беларусі сведчыць, што тут пашырэнне форм работы з аўдыторыяй краязнаўчых музеяў назіралася толькі ў самым канцы акрэсленага перыяду. Асноўнымі ж формамі культурна-адукацыйнай дзейнасці беларускіх музеяў, у тым ліку і краязнаўчых, былі лекцыі і экскурсіі. Прычым, у дакументах неаднаразова сустракаюцца патрабаванні, каб час працы музеяў быў падоўжаны і рабочыя і сяляне маглі пазнаёміцца з экспазіцыямі музеяў. У сувязі з развіццём турызму як формы правядзення вольнага часу шырокіх колаў насельніцтва і знаёмства з гісторыка-культурнай спадчынай краіны музеі становяцца аб'ектам турыстычнага агляду. Недахопы названага перыяду пачалі пераадольвацца на наступным этапе.

**Інфарматыўная мадэль культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчага музея.** 1960-я – канец 1980-х гг. характарызуецца імкненнем вярнуць музею статус навуковай (а не толькі прапагандысцкай) установы, страчаны ў папярэдні перыяд. Упершыню была сфармулявана ідэя аб спецыфічнасці адукацыйнага працэсу ў музеі. Пошукі музеем свайго месца ў сістэме інстытутаў культуры і адукацыі звязаны з зацвярджэннем інфарматыўнай мадэлі. У адпаведнасці з апошняй музей разглядаўся як сродак распаўсюджання ведаў, якія маюць прадметную аснову і навуковы характар. Гэтыя змены адбіліся і на тэрміналогіі: замест тэрміна "*асветніцкая праца*" стаў ужывацца тэрмін "*навукова-асветніцкая дзейнасць*".

У адстойванні музеем сваёй адукацыйнай спецыфікі, якая заключалася ў распаўсюджванні навуковых ведаў, закладзеных у музейных прадметах, быў увасоблены важны сэнс. Упершыню за гады Савецкай улады музей дэклараваў сваё права распаўсюджваць навуковыя веды з дапамогай аўтэнтычных прадметаў. З адстойваннем гэтага права ў той ці іншай ступені быў звязаны так званы "музейны бум" 1960–1980-х гг., калі колькасць наведвальнікаў музея значна павялічылася, што было абумоўлена змяненнем агульнай сацыякультурнай сітуацыі ў краіне, значным пашырэннем турызму, заснаваннем грамадскіх аб'яднанняў па ахове помнікаў гісторыі і культуры, узросшай цікавасцю да свайго мінулага і гісторыка-культурнай спадчыны. Музей апынуўся ў цэнтры грамадскай увагі. Дыскусіі аб музеях, музейнай дзейнасці, праблемах аховы помнікаў актыўна абмяркоўваліся не толькі на старонках прафесійнага друку, але больш шырокага, у тым ліку і мясцовага друку. Важна дадаць, што ў гэты перыяд на тэрыторыі Беларусі было заснавана і адкрыта больш за 30 краязнаўчых музеяў, што складае 42% ад агульнай колькасці краязнаўчых музеяў, якія існавалі на той момант. Гэта значна больш, чым у папярэднія і наступныя дзесяцігоддзі. У акрэслены перыяд у краязнаўчых музеях пашыраюцца формы работы з музейнай аўдыторыяй. Акрамя экскурсій і лекцыі з'яўляюцца такія новыя формы, як сустрэчы з цікавымі людзьмі, музейныя святы (дакладней, яго правобразы, увасобленыя ў такіх музейных рытуалах, як прыём у піянеры, уручэнне пашпартоў і г.д.), літаратурныя вечарыны, канцэрты і інш. Аднак, нягледзячы на актывізацыю навуковай дзейнасці, пашырэнне форм работы з аўдыторыяй, музеі працягвалі заставацца ідэалагічнымі ўстановамі, якія будавалі сваю працу ў адпаведнасці з дырэктыўнымі ўказаннямі кіруючых органаў і пастановамі ЦК КПСС. Дарэчы, менавіта ў гэты перыяд двойчы прымаюцца Пастановы ЦК КПСС аб музеях: "Аб павышэнні ролі музеяў у камуністычным выхаванні працоўных" (1964) і "Аб павышэнні ідэйна-выхаваўчай работы музеяў" (1982). Гэтыя дакументы ў чарговы раз сведчылі аб перавазе ідэалагічнай складаючай у музейнай дзейнасці. Адлюстраваннем залежнасці музея ад ідэалогіі і партыйных рашэнняў стала фарміраванне і распаўсюджанне такога тэрміна, як "ідэйна-выхаваўчая работа".

**Камунікатыўная мадэль культурна-адукацыйнай дзейнасці краязнаўчага музея.** У канцы 1980-х – пачатку 1990 гг. адбываўся паступовы адыход ад інфарматыўнай мадэлі на карысць мадэлі *камунікатыўнай,* якая доўжыцца па сённяшні дзень. Калі ў заходнееўрапейскіх краінах камунікацыйны падыход да музеяў, сфармуляваны ў 1960-х гг. канадскім спецыялістам Д. Камеронам, даволі хутка распаўсюдзіўся, то ў СССР увогуле і ў Беларусі ў прыватнасці ён з'явіўся значна пазней. Ён не быў непасрэдна звязаны з перабудовай, але так ці інакш змены, якія адбыліся ў дзяржаве, падштурхоўвалі музей пазбавіцца ад ідэалагічных установак. Аб неабходнасці перамен у працы музеяў з наведвальнікамі асобныя навукоўцы гаварылі і да пачатку пераломных падзей у нашай краіне [11, с. 42].

Адукацыйная мадэль, заснаваная на камунікацыйным падыходзе, прыўнесла шэраг навацый ва ўзаемадносіны музея і яго наведвальнікаў. Згодна новаму падыходу задачы музея не зводзяцца толькі да перадачы інфармацыі аб тым ці іншым прадмеце ці з'яве. Прыярытэтнымі ва ўзаемадзеянні

Рэпазіторый БДПУ

з наведвальнікам становяцца зварот да ўнутранага свету наведвальніка, уздзеянне на яго пачуццёва-эмацыйную сферу, пагружэнне ў гістарычнае асяроддзе, актывізацыя яго ўяўлення і асацыятыўнага ўспрыняцця. Адмова ад папярэдняй жорсткай ідэйна-інфарматыўнай накіраванасці змяняла і характар ўзаемаадносін паміж музеем і аўдыторыяй: наведвальнік пачаў успрымацца не як аб'ект выхаваўчага уздзеяння, а як раўнапраўны суразмоўца, у выніку чаго зносіны музея з аўдыторыяй набываюць дыялагічны характар.

Сучаснае ўсведамленне адукацыйнай ролі музея ў сацыякультурнай прасторы праявілася ў развіцці інавацыйных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці. Інавацыйнымі можна лічыць формы, якія запазычаны з іншых сфер культуры, адукацыі і навукі ці абумоўлены развіццём новых тэхналогій музейнай дзейнасці, і існуюць адносна нядаўна (не больш 40 гадоў). Характэрнай рысай інавацыйных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці становіцца актыўнае ўключэнне наведвальнікаў у музейна-камунікацыйны працэс. Да інавацыйных форм культурна-адукацыйнай дзейнасці можна аднесці музейна-педагагічныя заняткі і праграмы, майстар-класы і творчыя майстэрні, музейныя гульні, музейныя святы і некаторыя іншыя.

Змяненне ўяўленняў аб сутнасці адукацыйнай дзейнасці музея традыцыйна праявілася ў з'яўленні новага тэрміна – культурна-адукацыйная дзейнасць, які найбольш дакладна адлюстроўвае характар адукацыйнага працэсу ў музеі, а менавіта адукацыя ў сферы культуры. Аднак аналіз публікацый, прысвечаных гэтай сферы музейнай дзейнасці, і структуры краязнаўчых музеяў, сведчыць, што ў дадзены перыяд працягваюць выкарыстоўвацца такія тэрміны, як навукова-асветніцкая і ідэйна-масавая работа, навуковая прапаганда і папулярызацыя, музейная педагогіка. Такая разнастайнасць захавалася і ў афіцыйных дакументах. Так, у Кодэксе аб культуры (2016) сярод музейных відаў адзейнасці згадваюцца і экскурсійнае абслугоўванне, і культурна-асветная работа, і культурна-адукацыйная дзейнасць і папулярызацыя. На думку аўтараў назвага заканадаўчага дакумента, менавіта папулярызацыя гісторыка-культурнай спадчыны з'яўляецца важнай складаючай місіі музея [12, с. 87]. Такая тэрміналагічная разнастайнасць у дадзеным выпадку сведчыць аб адсутнасці адзінага падыходу да разумення таго, дзеля чаго музей сустракаецца са сваёй аўдыторыяй.

**Заключэнне.** Такім чынам, культурна-адукацыйная дзейнасць краязнаўчага музея як адзін з накірункаў работы прайшла наступныя этапы:

1850-я – канец 1920-х гг. – музей разглядаецца як асветная ўстанова – асветніцкая мадэль узаемаадносін музея і яго аўдыторыі;

канец 1920-х – 1960-я гг. – музей пачынае ўспрымацца як "паліт-асветкамбінат" – прапагадысцкая мадэль;

1960-я – канец 1980-х гг. – музей успрымаецца як месца канцэнтрацыі крыніц па розных галінах ведаў – інфармацыйная мадэль;

канец 1980-х гг. – цяперашні час – музей атаясамліваецца з месцам дыялогу культур – камунікацыйная мадэль.

На ўсіх этапах развіцця краязнаўчага музея сфера культурна-адукацыйнай дзейнасці музея заставалася адной з найбольш дынамічных. На працягу існавання краязнаўчага музея ўяўленні аб яго грамадскім прызначэнні і змесце працы з аўдыторыяй залежалі ад пануючай у пэўны перыяд адукацыйнай мадэлі. Прасачыць асноўныя этапы станаўлення культурна-адукацыйнай дзейнасці можна шляхам аналізу змен у тэрміналогіі, якая вызначала сутнасць узаемадзеяння музея з аўдыторыяй.

### ЛІТАРАТУРА

1. Аделунг, Ф. Предложение об учреждении Рускаго Национального Музея / Б. Вихман // Музееведческая мысль в России XVIII–XX веков: сб. документов и материалов / М-во культуры Рос. Федерации, Рос. ин-т культурологии; [авт.-сост.: Э.А. Шулепова и др.]; отв. ред. Э.А. Шулепова. – М., 2010. – С. 170–182.

2. Вихман, Б. Российский отечественный музей / Музееведческая мысль в России XVIII–XX веков: сб. документов и материалов / М-во культуры Рос. Федерации, Рос. ин-т культурологии; [авт.-сост.: Э. А. Шулепова и др.]; отв. ред. Э.А. Шулепова. – М., 2010. – С. 183–198.

3. Зан, Т. О методах и способах создания предполагаемого Музеума в Оренбурге / Т. Зан // Музееведческая мысль в России XVIII–XX веков: сб. документов и материалов / Мин-во культуры Рос. Федерации, Рос. ин-т культурологии; [авт.-сост.: Э.А. Шулепова и др.]; отв. ред. Э.А. Шулепова. – М., 2010. – С. 225–229.

4. Грабянчук, І. Віленскі музей старажытнасцей: заснавальнікі і наступнікі / І. Грабянчук // Музейны веснік. / укл. Н. Калымага, А. Ладзісаў; Нац. Музей гісторыі і культуры Беларусі. – Мінск, 2006. – Вып. 3. – С. 33–41.

5. Гужаловский, А.А. Просветительская работа музеев Белоруссии в дооктябрьский период / А.А. Гужаловский // Вопросы искусства и культуры Белоруссии: науч. сб. / Мин. ин-т культ. – Минск, 1991. – С. 8–13.

6. Церковно-археологическое древлехранилище // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1906. – № 22. – С. 6–7.

7. Музеи и архивы // Известия Императорской археологической комиссии. – 1914. – Вып. 56. – С. 61–80.

8. Музееведческая мысль в России XVIII-XX веков: сб. документов и материалов / Мин-во культуры Рос. Федерации, Рос. ин-т культурологии; [авт.-сост.: Э.А. Шулепова и др.]; отв. ред. Э.А. Шулепова. – М.: Этерна, 2010. – 957, [1] с.

9. Пастанова № 58 Колегіі Народнага Камісарыяту Асьветы БССР ад 11/IV-32 г. // Савецкая краіна. – 1932. – № 4. – С. 84–85.

10. Юхневич, М.Ю. Я поведу тебя в музей / М.Ю. Юхневич. – М.: РИК, 2001. – 223 с.

11. Разгон, А.М. Некоторые направления научных исследований деятельности школьных музеев / А.М. Разгон // Коммунистическое воспитание учащихся музейными средствами: сб. науч. тр. / [сост. М Ю. Юхневич]. – М., 1983. – Вып. 122. – С. 42–44.

12. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры: [прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г.: адоб. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г.]: уступае ў сілу з 3 лют. 2017 года. – Мінск: Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2016. – 270, [1] с.

*Паступіў у рэдакцыю 31.03.2020*

Репозиторий ВГУ